### 4.2.3 Логіка-семантычныя

Функцыянальны дыяпазон словаформ у парадыгме структурна-сінтаксічных мадыфікацый абумоўлены логіка-семантычнымі фактарамі (акрамя сінтаксічных) і пашыраецца за кошт імпліцытнай семантыкі, якую яны набываюць у выніку логіка-семантычнага ўзаемадзеяння, сінтаксічныя сувязі і адносіны ў якіх маюць пераменны характар. Падобныя з’явы назіраюцца выключна ў парадыгме структурна-сінтаксічных мадыфікацый эліптычная канструкцыя – эліптычная канструкцыя з імпліцытнай семантыкай.

Поліфункцыянальны характар і імпліцытную семантыку ў парадыгме структурна-сінтаксічных мадыфікацый часцей набываюць ***інфінітывы*** ў выніку нейтралізацыі першасных сінтаксічных сувязей, адносін і фарміравання новых. Логіка-семантычнае ўзаемадзеянне кампанентаў надае словаформе сінкрэтычны характар: форма і функцыя іх не супадаюць.

Дыяпазон словаформы ўключае наступныя сінтаксічныя функцыі, якія прынята называць імпліцытнымі: выказнік – акалічнасць мэты – акалічнасць месца – акалічнасць часу – азначэнне; семантычныя: прэдыкат – фінітыў-4 – лакатыў (імпл.) – тэмпаратыў (імпл.). Канструкцыйна абумоўленая пазіцыя словаформы патрабуе кантэкставых сродкаў кампенсацыі эліпсіса: *Мы выйгралі тэндар на праектаванне рудніка ў Валгаградскай вобласці, што, відаць, было ўзята ў разлік. Таму мы хацелі супрацоўнічаць з Расійскім праектным інстытутам. Заказчыкі ж –* ***атрымаць*** *гатовы праект* («Звязда»); *– Кажаш, скончыў сямігодку? – пытае Мікалай. – А цяпер куды? –* ***Вучыцца.*** *У Жыздрыцу* (Л. Калюга); *– Ты куды гэта? –* ***Шукаць*** *работы* (А. Кулакоўскі); *– Ты надоўга? – пытаецца дзядзька Язэп. – Толькі* ***пакурыць*** (А. Якімовіч); *У гэтым нумары часопіса чытача чакае працяг рамана Андрэя Федарэнкі «Рэвізія»... Класіка адметная тым, што кнігалюбы маюць патрэбу чытаць і перачытваць творы. Мы ж –* ***выдаваць і перавыдаваць*** *іх* (ЛіМ).

Намі выяўлены выпадкі, калі канструкцыйна абумоўленыя словаформы набываюць *спецыфічнае семантычнае напаўненне.* Іх камбінаваны характар абумоўлены некалькімі фактарамі: яны характарызуюцца логіка-семантычнымі або сінанімічнымі пераўтварэннямі ці змяшчаюць з’явы імплікацыі і трансфармацыі адначасова. Спецыфічнасць семантычнага напаўнення заключаецца ў тым, што эліптычны сказ з лакатывам тыпу *мы – да бульбы* абазначае не кірунак руху, а працу на гэтым аб’екце: *мы будзем выбіраць бульбу, мы будзем баранаваць бульбу* і інш. Такія з’явы складаюць *канструкцыйна-семантычную адметнасць беларускай мовы.*

Калі эліптычны сказ ужываецца ў парадыгме аманімічных форм, то функцыя словаформы мае сінкрэтычны характар: *– Вы куды, журавы, куды? – Мы* ***да сонца, да*** *сіняй* ***вады*** (М. Шабовіч); *– Вы, мабыць, у горад хочаце перайсці? –*

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

*Я лепш у **лясок, да ракі*** (А. Кулакоўскі); – *Марыля, дачка дома? – запытаў брыгадзір у кабеты, што палола гуркі. – Яна – **да каровы**. Будзе пазней, – адказала тая не разгінаючыся* (М. Зарэцкі); – *Ты надоўга? – запытаў Хвядос у Мікалая. – **Толькі па коні**. І адразу дахаты* (Л. Калюга). Якасна-колькасныя змены словаформы ў форме *роднага склону* абумоўлены рознымі фактарамі адначасова, што дазваляе ёй выконваць розныя (у тым ліку і прэдыкатыўную) функцыі – прэдыкат (імпл.) – тэмпаратыў (імпл.) – лакатыў (дадатак Д.2.3).

Функцыянальны дыяпазон словаформ у канструкцыях з эліпсісам дзеяслова можа пашырацца за кошт таго, што яны набываюць імпліцытную семантыку, якую ў большасці выпадкаў маюць сінтаксемы, выражаныя ***інфінітывам*** у выніку логіка-семантычнага ўзаемадзеяння канструкцый (4). ***Іменныя сінтаксемы*** ў парадыгме аманімічных форм таксама могуць мець імпліцытную семантыку (3), аднак яны пры гэтым маюць спецыфічнае семантычнае напаўненне. Поліфункцыянальнасць словаформ у парадыгме структурна-сінтаксічных мадыфікацый канструкцыі з эліпсісам дзеяслова – канструкцыі з імпліцытнай семантыкай – рэгулюецца сэнсавымі моўнымі механізмамі (рысунак 4.6).




**Рысунак 4.6. – Прадуктыўнасць словаформ, абумоўленая логіка-семантычнымі фактарамі**

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Такім чынам, можна сцвярджаць, што поліфункцыянальны характар словаформ у парадыгме структурна-сінтаксічных мадыфікацый (канструкцыі з эліпсісам дзеяслова – канструкцыі з імпліцытнай семантыкай – вытворныя канструкцыі) абумоўлены наступнымі фактарамі: кантэкстуальна-катэгарыяльнымі (эліпсіс), логіка-семантычнымі (імпліцытная семантыка), сінанімічнымі пераўтварэннямі (трансфармацыя).

Функцыянальны дыяпазон словаформ рэгулюецца рознымі моўнымі механізмамі. *Фармальныя моўныя механізмы* ўзгадняюць від эліпсіса, характар структурна-сінтаксічнага паказчыка, сінтаксічныя сувязі і адносіны і адпаведна поліфункцыянальнасць словаформ у парадыгме структурна-сінтаксічных мадыфікацый *эліптычная канструкцыя – эліптычная канструкцыя*. Пры гэтым адбываюцца катэгарыяльныя змены сінтаксемы. *Сэнсавыя моўныя механізмы*

рэгулююць узаемадзеянне словаформ на логіка-граматычным узроўні і адпаведна іх поліфункцыянальнасць у парадыгме структурна-сінтаксічных мадыфікацый эліптычная канструкцыя – канструкцыя з імпліцытнай семантыкай. *Інтэрпрэтацыйныя моўныя механізмы* прадвызначаюць розныя сінанімічныя пераўтварэнні сінтаксічных канструкцый і адпаведна поліфункцыянальнасць словаформ у парадыгме структурна-сінтаксічных мадыфікацый *эліптычная канструкцыя – вытворная канструкцыя*. Прычым у большасці выпадкаў словаформы ў парадыгме структурна-сінтаксічных мадыфікацый уступаюць у адносіны канструкцыйна-сінтаксічнай аманіміі і толькі нязначная іх частка – у адносіны канструкцыйнай аманіміі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ